Opłacono gotówką.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі Вільня, Літоўская вул. № 25—1.

Рэдакцыя і Адміністрацыя адчынены ў панядзелкі, серады і суботы ад г. 9 да 12 г.

ЦАНА АСОБ. НУМ. 15 ГР.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на месяц — — 0.50 гр.
у паўгодкі — — 2.50 „
у год — — — 5.00 „

ЦАНА АБВЕСТАК паводле ўмовы. Для інстытуцыяў, грамадзкіх арганізацыяў і шукаючых працы значная зьніжка.

ШЛЯХ

Тыднёвая, народная, палітычна-эканамічная і грамадзкая газэта.

№ 3. Вільня, Пятніца, 25-га лістапада 1932 г. Год I.

НАШЫМ НАРОДНЫМ ПОЭТАМ ЯНКУ КУПАЛЕ і ЯКУБУ КОЛАСУ ў 50-тыя ЎГОДКІ НАРАДЗІНАЎ ШЛЁМ ГАРАЧАЕ БРАТЭРСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ.



Янка Купала.



Якуб Колас.

Дымісія ураду Папэна у Нямеччыне.

Дня 17-га лістапада, пасьля трохгадзіннае нарады нямецкага кабінэту, канцлер Папэн зьвярнуўся да прэзыдэнта Гіндэнбурга, катораму злажыў дымісыю усяго ўраду. Гіндэнбург дымісыю прыняў.

Адстаўка ўраду выклікана безпасярэдня той акалічнасьцю, што Папэну не ўдалося стварыць т. зв. блёку нацыянальнай канцэнтрацыі. Заданьне стварэньня падобнага блёку, які-б абыймаў сабою ўсе неработніцкія партыі ад адкрытых фашыстаў гітлероўцаў да сацыял-дэмакратаў уключна—зьяўляецца сяньня ў Нямеччыне вельмі актуальным у сувязі з тым грамадзкім працэсам, які там адбываецца. Вось-жа ўрад Папэна ня змог аб'яднаць навакола сябе ўсіх тых угрупаваньняў, якія прынцыпова стаяць на грунце захаваньня існуючага парадку рэчаў. Сацыял-дэмакраты і кіраўнікі Цэнтру не згадзіліся на падданьне сябе пад кіраўніцтва Папэна. Адсюль дымісыя гэтага апошняга і імкненьне нямецкіх пануючых клясаў, да стварэньня такога ўраду, які-б зрабіў тое, што не ўдалося Папэну.

Замах на жыцьцё францускага прэм'ера Эріо.

20-га лістапада на чыгунцы Інгранд-Нант, перад праходам цягніка, у якім ехаў Эріо, адбыліся два выбухі. Выбухі гэтыя зьнішчылі чыгунку на працягу некалькіх мэтраў. Цягнік быў затрыманы ў некалькіх кілямэтрах ад мейсца выбуху. Пасьля гэтага прэм'ер-міністар заявіў прадстаўніку аднаго з тэлеграфічных агенстваў, што замах быў арганізаваны нікім іншым, як брэтанскімі сэпаратыстамі.

Працэс ППС-лявіцы у Лодзі.

Ужо трэці тыдзень адбываецца ў Лодзкім Акружным Судзе працэс ППС-лявіцы. На лаве абвінавачаных знаходзіцца 36 асобаў. Акт абвінавачаньня закідае ім анты-дзяржаўную дзейнасьць.

Выпадкі у Вілянове.

У нядзелю 20 г. м. адбываўся ў Вілянове мітынг пад голым небам, арганізаваны Страніцтвам Людовым. На мітынг прыбыло каля 1.300 асоб. З кіраўнікоў Стр. Людовага былі прысутныя: Вітас, Кернік, Носэк, Багінскі, Смола, Маліноўскі, кс. Панась, Космоўская і інш.

Першы прамаўляў Маліноўскі. Народ прамову яго выслухаў спакойна. Калі-ж на трыбуне паявіўся кс. Панась, пачалі узносіцца крыкі супроць кіраўнікоў мітынгу, а пасьля натоўп пачаў напіраць на трыбуну і заняў яе. У часе гэтага забурэньня лёгка ранены прадстаўнік старостава, камэндант паліцыі і адзін паліцыянт, які бараніў кс. Панася перад натаўпам.

З прычыны таго, што ня можна было ўспакоіць сабраных, прадстаўнік улады мітынг разьвязаў і паліцыя прыступіла да ліквідацыі мітынгу, арыштоўваючы некалькі асобаў.

Кіраўнікі мітынгу і паслы атрымалі паліцыйную варту перад абураным натаўпам, якая адвязла іх аж да Варшавы.

Забастовачны рух у Гішпаніі.

Забастовачны рух у Гішпаніі набірае што раз большых разьмераў ня толькі ў самой Андалюзыі, але і ўва ўсім краі а перадусім у Астурыі, дзе 30 тысяч бастуючых рабочых абвесьціла, што будзе прадаўжаць забастовачную акцыю аж пакуль урад ня прызнае іх жаданьняў. Падобная сытуацыя пануе ў Сэвільлі. Забастоўка набрала характару агульнага. Бастуючыя стралялі ў трамваі, стараючыся іх падпаліць. Трамваі курсуюць пад эскортай паліцыі. Бастуючыя ня ўпускаюць у горад малочнікаў і гандляроў гароднінай. Пекары развозяць хлеб пад вартаю паліцыі. Паміж камуністамі і сацыялістамі адбылася вострая страляніна, у каторай некалькі асоб ранена.

У Барсэлёне прыступіла ўчора да забастоўкі 100 тысяч тэкстыльшчыкаў. Студэнты ў большасьці ўнівэрсытэтаў перасталі хадзіць на лекцыі. У Сарагоссе перад будынкам унівэрсытэту адбыліся ўчора бойкі, каторыя не прынесьлі людзкіх ахвяраў, але прычынілі шмат шкодаў. Гішпанскі ўрад прыняў энэргічныя сродкі з мэтаю здушэньня і зліквідаваньня забурэньняў.

Культура у Б.С.С.Р.

— Беларуская кінэмотографія ў Б.С.С.Р. „Як падае „Зьвязда" з 28. X. 1932 г. у апошні час наглядаецца буйны разрост беларускай кінэмотографіі, якая, пачаўшы з фільму „Лясная Быль" паводле повесьці М. Чарота, праз цудоўна скампанаваныя фільмы, як „Ненавісьць", „Слава сьвету", „Заходні фронт" дайшла да супэрфільму, першага гукавага поўнамэтражнага фільму на беларускай мове „Баём насустрач", які ставіць кіно-фабрыку Белдзяржкіно на адно з першых месц у сыстэме Саюзкіно, слаўнага на ўсім сьвеце з фільмаў высокае мастацкае вартасьці. Беларуская кіно-фабрыка дала цэлы рад здольных рэжысэраў, сцэнарыстаў, артыстаў, як: Кобец, Вольны, Губарэвіч, Тарыч, Керш і іншыя".

— Дом вучоных ў Менску. „Як падае „Зьвязда" з 25.-X. 1932 г. пры новаадчыненым у Менску Доме Вучоных паўстае бібліятэка, чытальня, паліклініка і сталоўка выключна для сяброў дому. Да гэтага часу прыняты 123 чалавекі: 7 акадэмікаў, 35 прафэсароў, рэшта—навуковыя працаўнікі вышэйшай катэгорыі. З гэтай колькасьці—48 чалавек сябры і кандыдаты ком. партыі.

У Савет Дому Вучоных выбраны: Бэнэк, Платун, Рыстлін, праф. Гаўсман, акадэмік Панкевіч, Прэзыдэнт БАН Горын, акад. Бурстын, акад. Вольфсон, праф. Сурта, Якуб Колас, праф. Рубашоў, праф. Пятуховіч, Кандыбовіч, Шапіра, Барысэвіч і інш.

Гэтыя весткі дасллоўна перадрукоўваем з „Бел. Звону". Якраз-жа ніяк не перашкаджаюць А. Н. (псэўдонім А. Луцкевіча) у тым-жа „Звоне", з нагоды юбілею Я. Коласа, выразіцца так:

„Праўда, пэўне і шмат цяжкога прышлося перажыць за апошнія гады Коласу, гледзячы, як сталінаўскія агенты пачалі паход проці беларускае культуры і беларускага народу, **зьніштажаючы і разганяючы па ўсёй Расеі беларускую інтэлігенцыю**"... (падкр. нашае—Рэд.).

Нам здаецца, што гэта ня зусім пасуе да весткі аб Доме Вучоных у Менску.

БЕЛАРУСКАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ.

Звычайна пад інтэлігенцыяй разумеюць людзей, маючых тую ці іншую вышэйшую ад агульнай у краі адукацыю, здабытую ці то шляхам канчэньня адпаведніх школ ці проста самаадукацыяй. Людзі гэтыя звычайна бяруць больш жывы ўдзел у грамадзкім жыцьці, некаторыя з іх, як напр. публіцысты, пісьменьнікі, цалком пасьвячаюць увесь свой час для яго, чэрпаючы з гэтага сабе сродкі для існаваньня. Інтэлігенцыяй запаўняюцца рады ўрадоўцаў, т. зв. вольных прафэсіяў, як дахтары, адвакаты і г. д. Яна творыць той культурны пласт, які мы бачым ува ўсіх народаў.

Значэньне інтэлігенцыі ў жыцьці сучаснага грамадзтва зразумела не апошняе. Аднак інтэлігенцыя не прадстаўляе сабой нейкага аднолітага грамадзкага ўкладу, нейкай самастойнай сілы. Наадварот, яна напамінае сабою нешта падобнае крывому люстру, у якім да пэўнай меры адбіваюцца адносіны асноўных грамадзкіх сіл. Таму, памінаючы ўжо справу матэр'яльнай няроўнасьці, сярод інтэлігенцыі існуе столькі ідэёвых кірункаў, скольki іх знаходзім і даным грамадзтве.

У жыцьці здабыўшага самастойнасьць народу інтэлігенцыя мае вялікае значэньне ў развіцьці яго творчых сіл. Аднак ня слушна было-б думаць, што інтэлігенцыя служыць усяму народу. Па сваёй прыродзе, у сваёй асноўной масе інтэлігенцыя стаіць на службе той часткі народу, якая знаходзіцца пры ўладзе. І толькі нязначныя выняткі, зразумеўшыя ход гістарычнага разьвіцьця, адыходзяць ад гэтага правіла.

Ня меньшае, калі ня большае значэньне мае інтэлігенцыя для нацыянальна-вызваленчага руху народу, які яшчэ не здабыў сабе самастойнасьці. Тут яна можа адыграць значную ролю ў галіне ўсьведамленьня народных мас, паглыбляючы і пашыраючы іх ідэолёгію і падымаючы іх культурны ўзровень. Мала таго, яна можа стацца важным чыньнікам перамогі народу, калі ёй хопіць адвагі і ахвярнасьці йсьці рука аб руку з шырокімі народнымі масамі аж да здабыцьця самастойнасьці. На жаль, інтэлігенцыя элемэнт часта надзвычай хісткі і ў трудных хвілінах пакідае цяжкое змаганьне. Тагды яна ня варта пладоў сяўбы і гарачага жніва...

Мы, беларусы, таксама маем, праўда ня лічную, інтэлігенцыю. Гэта перадусім цяперашнія і быўшыя вучыцялі, дзеячы групуючыяся каля рэдакцыяў газэт і грамадзкіх арганізацыяў, студэнты і інш. Як і ўсюды, не прадстаўляе яна аднолітай групы і ня можа такой быць, таксама як ня можа быць аднаго нейкага кірунку ў бел. руху, паскольki заходня-беларускі народ не прадстаўляе сабой аднолітай масы, але складаецца з шырокіх працоўных пластаў і параўнаўча не вялікай заможнай часткі. Гэтае рассластаваньне знаходзіць сваё адбіцьцё ў рознасьці палітычна-эканамічных інтарэсаў і ў той ці іншай ідэолёгіі. Рамкі артыкулу не пазваляюць затрымацца больш над гэтым пытаньнем, што пастараемся зрабіць у будучыні.

У сувязі з гэтым рассластаваньнем народу ў асноўным расслаштоўваецца і актыўная ў грамадзкім жыцьці беларуская інтэлігенцыя на два лягеры. Характэрнай адзнакай адной часткі ёсьць тое, што яна хоча **„вясьці"** і **„вучыць"** народ. Такой-жа адзнакай другой часткі ёсьць тое, што яна хоча ісьці з народам і ня толькі нясьці яму асьвету, але і ў яго вучыцца. Першая хоча, прышчапіць у народзе—клапоцячыся, каб ён часам ня зьдзічэў — ідэалёгію, чужую яму, хоча змабілізаваць большасьць да змаганьня за рэпрэзэнтаваныя сабою інтарэсы меншасьці; другая, веручы ў творчыя сілы народу, прызнае тую ідэалёгію, якая ўжо існуе ў народзе і якая зьяўляецца вытварам нацыянальна-вызваленчага руху, прызнае інтарэсы большасьці народу, якія супярэчаць інтарэсам яго меньшасьці. Гэтая розьніца ў падыходзе і ідэалёгіі робіць паміж гэтымі часткамі глыбокую пропасьць і акрэсьлівае сабой іх тактыку, іх грамадзкую этыку. Тут вось хаваецца глыбокі сэнс таго падзелу беларускага грамадзянства, аб якім чуюцца „жаласныя" галасы з боку тых, хто гэтым хоча прыкрыць свае нячыстыя інтарэсы і хто хоча „вучыць" народ, замест таго, каб у яго павучыцца.

Шчыраму беларускаму грамадзянству шкадаваць такога падзелу інтэлігенцыі ня прыходзіцца. Ён быў і будзе. Не паможа тут паклікаўне на нейкія „варожыя правакацыйныя сілы", для прыкрыцьця такой іменна работы тых чыньнікаў, якія аб гэтым галосяць. Не паможа тут таксама і цьверджаньне, што „беларусы сваёй буржуазіі ня маюць. Беларусы—гэта сяляне, работнікі і працоўная інтэлігенцыя". Такія „праўды" ізноў-жа патрэбны тым, хто гэтага ня хоча бачыць. Грамадзкія кірункі не зьмяняюць сваёй ідэолёгіі, так як паасобныя прадстаўнікі гэтых кірункаў, ня

„лучацца“ на „асобных адрэзках“ як гэта могуць рабіць тыя-ж прадстаўнікі. Грамадзкі рух узалежнены ад укладу грамадзкіх сіл данага народу, які ня так ужо лёгка зьмяняецца па сваёй волі. Пакуль большасьць народу будзе знаходзіцца ў аднолькавых палітычных і эканамічных умовах, датуль яны будуць крыніцай адпаведнага грамадзкага кірунку, які можа мець свае ўздымы і спускі, свае паражкі і перамогі, свае тыя ці іншыя арганізацыйныя формы, тых ці іншых правадыроў — але сам як такі будзе існаваць нязьменна.

Таму воесь, шчырай беларускай інтэлігенцыі як найменш выпадае думаць аб тым, як пагадзіць „пасваранае“ беларускае грамадзянства. „Гадзіць“ тое, што ня можа быць пагоджаным, г. зн. фактычна прыкрываць сваю бяздзейнасьць пустымі гутаркамі. Шукаць „пагаджэньня“ на асобных „адрэзках“ (ad hoc) — гэта сьцвярджаць сваю бязраднасьць. Ня можна гадзіцца з тымі, каторыя абкідаюць балотам адважныя і ахвярныя высілкі народных мас ды іх праўдзівых правадыроў.

Шчырай беларускай інтэлігенцыі выпадала-б задумацца (і ня толькі задумацца) над тым, як згуртаваць усе чэсныя і ахвочыя да беларускай народнай працы сілы, у якой форме знайсьці сувязь з шырокімі народнымі масамі, а перадусім з вясковай інтэлігенцыяй „ад плуга і касы“ згуртаванай у масавых культурна-асьветных і грамадзкіх арганізацыях, ня рэдка працуючай і ў паасобку, якая часта ў надзвычай цяжкіх абставінах вядзе з народам ахвярную для яго працу. Выпадала-б задумацца, як прыцягнуць да грамадзкай працы тых, якія яе не вядуць, і тых, якія адыходзяць ад ідэолёгаў заможных пластоў бел. народу.

Мінулі часы, калі народ трэба было „будзіць“ і „вучыць“. Цяпер шмат чаму і ў яго трэба вучыцца. Таму беларуская інтэлігенцыя толькі тады зробіць неацэнены ўклад у народнаадраджэнскі рух, калі заключыць цэсны саюз з шырокімі народнымі масамі. Гэтага ня можна аднак зрабіць без аканчальнага зрыву іншых „саюзаў“.

ПА ШЫРОКІМ СЬВЕЦЕ.

Клопаты Зах. Эўропы. — Клопаты Усходу.

У папярэдніх нумарох „Шляху“ мы пісалі аб тым, што вядзецца шырокая акцыя пагаджэньня заходня-эўраўэйскіх дзяржаў. Ужо здавалася адналіты блёк паказаўся як ня трэба больш выразна, аднак за апошні тыдзень у ім выйшлі на верх паважныя рысы.

Перш-на-перш выплыла справа ваенных даўгоў. Для некалькі сот мільёнаў людзей вайна азначала сьмерць і зьнішчэньне, для амэрыканскіх-жа капіталістаў — інтарэсам на якім яны шмат зарабілі. Каб ваяваць—трэба грошы. Вось ПАЗШ іх пазычыла Англіі, Францыі, Італіі, Бэльгіі і інш., ведама за добрыя працэнты. Гэтыя апошнія плацілі іх, цягнулі сокі з народу, нарэшце муселі сказаць—не, бо ня было ўжо з чаго цягнуць... Як мы ўжо коратка падалі ў папярэднім нумары, Англія паведаміла ПАЗШ, што ня можа заплаціць сёлетнюю рату, якая выносіць 80 мільёнаў даляраў, паклікаючыся на вялікае безработцце (больш 2 000.000) і на цяжкое палажэньне фінансаў. Тое-ж зрабіла і Францыя з сваёй ратай у 19 мільён. даляраў, паказваючы на дэфіцыт у бюджэце (8 мільярдаў франкаў) і на пагаршэньне гандлёвага білянсу. Тое-ж зрабілі Бэльгія, Грэцыя, Польшча і інш. Адмова плаціць доўг для ПАЗШ азначае ня толькі ўтрату вялікіх зыскаў, але сродка свайго націску на Эўропу. Гэтым будзе тлумачыцца вялікае ўпорства Амэрыкі ў разглядзе справы даўгоў, аб чым просяць Англія, Францыя і др. Упорлівасьць ПАЗШ, якія ў цяперашні мамэнт ня хочуць і гутарыць аб скарачэньні даўгоў, прывядзе да вялікіх супярэчнасьцяў паміж дзяржавамі.

Ня так было-б страшна, каб на гэтым клопаты кончыліся. Ход выпадкаў паказаў, што кіраўнікі дзяржаў трацяць на іх усялякі ўплыў. Усе гэтыя прэм'еры і міністры падобны да тонучых людзей, якія хапаюцца, то за плывучае бервяно, то за нейкую іншую рэч, каб потым ізноў абарвацца і ўпасьці ў ваду. Яшчэ нядаўна мы пісалі, што нямецкі ўрад згадзіўся вясьці перагаворы на падставе „разбраенёвага“ францускага пляну. А вось некалькі дзён таму назад, той-жа нямецкі ўрад востра выступае проці францускага пляну, кажучы, не бяз слушнасьці, што ён хоча ўвечніць палітычную гегемонію (перавагу) Францыі і яе саюзьнікаў у Эўропе, а Лігу Народаў выкарыстаць як добры інструмант для замацаваньня гэтай гегемоніі, далей урад рэзка сьцьвярджае, што францускі плян поўнасьцю пазбаўлены думкі аб разбраеньні. Ня трэба дадаваць які будзе лёс, у такім выпадку, перагавораў на гэтую тэму.

Бязсумліву такі паварот зьвязаны з нядаўнай адстаўкай канцлера Папэна і азначае, што будучы ўрад будзе яшчэ больш вымагаючым у кірунку збраеньня, якому войска патрэбна будзе ня толькі для барацьбы з вонкавым, але і ўнутраным ворагам. Не для каго ня ёсьць тайніцай, што ў будучым урадзе гітлероўцы будуць адным з галоўных чыньнікаў. Гэта будзе ўрад аткрытай дыктатуры. Рабочыя Нямеччыны ўжо спатыкаюць яго масавымі дэманстрацыямі...

Нічога дзіўнага, што ў абліччу такіх клопатаў п. Мікляс, прэзыдэнт Аўстрыі, ня верыць, „што перад сарака або пяцідзесяцю гадамі дойдзе да поўнага выздараўленьня“. Нічога дзіўнага, калі той-жа Мікляс, кажа: „па маёй думцы, калі сёняшнія палітычныя і фінансавыя супярэчнасьці абсалютна, і то на мірнай дарозе, ня знойдуць вырашэньня, мусяць тады паўстаць сур'ёзныя канфлікты, якія пры пэўных абставінах могуць давесьці да новай вайны“.

І так, новая вайна, калі супярэчнасьці ня вырашацца мірным шляхам! А хто можа верыць у мірнае вырашэньне супярэчнасьцяў?..

Да гэтага часу займаліся мы клопатамі Зах. Эўропы. Ня можна абыйсьці моўчкі клопатаў Усходу, клопатаў СССР. Тэма гэтая бязумоўна вялікая, аб ёй напісаны ўжо горы кніжак, масы артыкулаў у часопісях і газэтах. Аднак гэта не павінна нас застрашыць хоць коратка заняцца гэтай справай.

У гэтым годзе Саветы абыходзілі сваю 15-ю гадавіну існаваньня. Год гэты быў т. зв. „чацьвертым, рашаючым годам пяцігодкі“. Ня будзем тут займацца падрабязным разборам дасягненьняў і недахопаў. Для нас важным будзе агульны кірунак разьвіцьця Саветаў. Што да гэтага, дык самыя заядлыя іх ворагі прызнаюць, што за 4 гады паўстала там паводле пляну вялікая машынная прамысловасьць, што створана падстава для вырабу тых машын і прыладаў у сябе ў краі, якія раней прывозіліся з-за межаў. Яшчэ нядаўна ўва ўсіх газэтах можна было чытаць апісаньні адкрыцьця адной з найбольшых у сьвеце электрычных станцыяў на Дняпры (Дняпробуд, цяпер—Дняпрогэс). Большасьць гаспадарак перайшлі на калектыўную (супольную) апрацоўку зямлі. Адным з галоўных цяперашніх клопатаў савецкай улады — гэта замацаваньне калектыўных гаспадарак. З гэтай мэтай нядаўна былі выдадзены тры дэкрэты (распараджэньні). Адзін з іх дазваляе калект. гаспадаркам вясьці вольны гандаль сваімі земляробскімі прадуктамі і хоча гэтым падняць іх гаспадарчы ровень. Другі дэкрэт накладае суровыя кары на зладзеяў калектыўнага дабра. Трэйці дэкрэт забараняе мясцовым уладам перадзяляць супольную зямлю і загадвае надзяляць сялян, якія хочуць выступіць з калектыву, зямлёй з вольных дзяржаўных запасаў, а не з кал. гаспадарак. Гэты дэкрэт мае замацаваць стан аграмаджаных зямель, а гэтым самым і калектыўныя гаспадаркі. У далейшым, не аслабляючы будаўніцтва вялікай прамысловасьці, маюць паўставаць фабрыкі і заводы для заспакаеньня першых патрэб вёскі, каб такім чынам мог павысіцца дабрабыт сялянскіх мас.

Гэтымі кароткімі ўвагамі аб клопатах будаўніцтва кончым наш сёняшні агляд.

Аглядчык.

Голас прэсы.

Як разьвіваць гаспадарку?!

У нумары 39 „Бел. Крыніца“ падае цікавы факт з жыцьця селяніна, які вельмі добра ілюструе сучасны стан незаможнага сялянства наагул:

„Жыхар вёскі Кернакі, Лідзкага пав., І. Балюкевіч меў на продаж два бараны і хацеў за іх купіць сабе на зіму боты. Падкарміў бараноў і, каб узяць лепшую цану, павёз іх прадаваць за 70 вёрст у Вільню. Узяў у гміне „пасьведчаньне паходжаньня“ бараноў—заплаціў 40 гр.; гмінныя „лякарскія агледзіны“ бараноў — каштавалі 2 зл. У Вільні трэба было бараноў паддаць вэтэрынарным агледзінам—каштавала гэта 5 зл. Разам усё каштавала 7 зл. 40 гр.—Зьявіліся купцы і Балюкевіч пачаў таргавацца. Па доўгім торгу Балюкевіч мусіў аддаць бараноў за 7 зл. 30 гр.

Такім чынам селянін за тое, што галаваў

К. Р.

Народны поэт—Якуб Колас.

У гэтым годзе беларускае грамадзянства абходзіць 50-цігадовы юбілей другога нашага народнага поэта Якуба Коласа — Міцкевіча. Наагул мы ня можам пахваліцца, так, як іншыя народы багацтвам падобных юбілеяў. Адносная ўбогасьць нашае літэратурна-мастацкае творчасьці зьяўляецца простым рэзультатам нашай беднасьці на волатаў слова, як Колас і Купала. І таму юбілей двух будзіцеляў народна-вызваленчае ідэі, двух піянэраў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху — набірае сяньня, асабліва ў нашых варунках, колёсальнага значэньня для ўсяе нашае працы.

3-га лістапада 1882 году ў вёсцы Мікалаеўшчыне, Менскага павету ў сям'і беднага селяніна Міхала Міцкевіча прыйшоў на сьвет сын Кастусь, прыйшоў маленькі Каласок, які ў будучыне стаўся магутным Коласам. Ужо ў маленстве сваім калі не зразумеў, дык адчуў маладзенькім уражлівым сэрцам, што ён сын „невясёлае“ „бяпрытульнае“ „мужыцкае вёскі“, дзіця краіны, дзе „поруч з галітвой ходзіць роскаш і багацьце; разам з людзкімі сьлёзамі мяшаюцца панскія вальцы, льлюцца вясёлыя галасы песень, грыміць музыка з панскага саду; разам з мужыцкім потам цякуць дарагія віны“. І з маладых дзён у душы будучага поэта пачала згушчацца, накіпаць ненавісьць супроць існуючага парадку, супроць грамадзкай несправядлівасьці, панска-абшарніцкай няволі. Вучыцца Кастусь пачаў ужо з 5 год, у чым яму моцна дапамагалі яго родные браты Пятрусь і Антон. Па скончэньні пачатковай школы ў Мікалаеўшчыне—Колас паступае ў Нясьвіскую вучыцельскую сэмінарыю. Маючы 20 год становіцца вучыцелем, дастаючы пасаду на Палесьсі.

Жывучы да 15 год у вускім акружэньні свае сям'і малады Кастусь прыглядаецца ня толькі да грамадзкіх стасункаў, але і да красы маткі-прыроды, любуецца яе буйным расьцьветам, вывучае яе прыгожасьць, стараецца ўнікнуць у „песьні хараў“, зразумець яе тайны. Колас ужо ў гэты пэрыод свайго жыцьця пакахаў усім сэрцам, усёй душою „поле шырокае, роднае поле“, зьліваецца з „барамі, лясамі, лугамі“, палюбіў малюнкі краіны, дзе „побач з сьмецьцем гожасьць пышная ўзрастае“. І гэтая бязьмерная, бязпрыкладная любоў, прывязаннасьць да красы роднае прыроды сталася ў будучыне багацейшай крыніцай для мастацкага, цудоўнага адмаляваньня яе ў найважнейшых творах Коласа. У пазьнейшыя гады Кастусь Міцкевіч у сваіх песьнях дае надзвычай бліскучы адбітак родных зьяў, ахвяруе нам найлепшы фотографічны здымак красы беларускай прыроды. „Як маляўнік прыроды — кажа І. Дварчанін у сваёй „Хрэстоматыі“—Колас стаіць па-над усімі беларускімі пісьменьнікамі і поруч з лепшымі пісьменьнікамі сусьветнымі“.

Настаўніцкая праца на Палесьсі ня толькі не перашкаджае, але наадварот дае шырокія магчымасьці для Якуба Коласа любавацца беларускай прыродай вывучаць быт працоўнага сялянства, унікнуць у глыбіню сацыяльнага і нацыянальнага палажэньня беларускай вёскі, чытаць шмат грамадзка-рэволюцыйнай літэратуры і такім чынам паступовa набраць перакананьня, што каб быць чэсным грамадзянінам, праўдзівым сябрам таго грамадзкага асяродзьдзя з якога выйшаў ня можна застацца на старане ад працы і барацьбы, якую вядуць шырокія народныя масы за вызваленьне з-пад нацыянальнага і сацыянальнага гнёту. Душа маладога Коласа перапоўнілася гарачым жаданьнем зьліцца з працоўным народам, пасьвяціць усяго сябе справе прыгнечаных. Ужо ў 1906 годзе выступае ён на арэну актыўнай грамадзкай дзеяльнасьці, прылучаючыся да таго сьвядомага беларускага грамадзянства, якое стаіць на грунце бязьлітаснай барацьбы супроць царскага рэжыму за сацыяльныя і нацыянальныя правы найшырэйшых колаў беларускага насельніцтва. Разам з Я. Купалай супрацоўнічае ў „Нашай Доле“ і „Нашай Ніве“, пішучы туды свае вершы, апавяданьні, артыкулы. Зразуменьне неабходнасьці распашырэньня беларускай школы, як важнейшага чынніка для абуджэньня і паглыбленьне ў масах народу нацыянальна-вызваленчай сьведамасьці наводзіць Коласа на думку аб тварэньні школаў у роднай беларускай мове. Але небясьпеку гэтай ідэі добра разумелі і царскія апрычнікі і таму ўсе сілы прыкладалі ў кірунку душэньня нават самой думкі аб беларускай школе. У зьвязку з гэтымі акалічнасьцямі Колас прыступае да працы над закладаньнем нелегальных беларускіх школаў. У 1906 годзе склікае ён у Вільні першы нелегальны беларускі вучыцельскі зьезд, на якім прысутнічаюць перадавыя вучыцялі-рэволюцыянеры таго часу. На зьезьдзе гэтым утвараецца сталае беларускае вучыцельскае Аб'яднаньне, якое ставіць сабе за мэту распашырэньне беларускай асьветы, шляхам закладаньня школаў у роднай мове. За працу гэтую Колас падлягае суровым перасьледаваньням з боку царскага ўраду, звальняецца з пасады вучыцеля і аддаецца пад суд за рэволюцыйную дзеяльнасьць. Аднак пясьняр, будучы перакананым у слушнасьці і прыгожасьці свайго ідэалу, не пакідае служэньня народу, а з яшчэ болшай энэргіяй прыступае да працы. У канцы 1906 году закладае ён першую беларускую школу з 12 вучнямі ў вёсцы Мікалаеўшчыне, складаючы адначасова першы падручнік для беларускіх школ: — „Другое чытаньне“. У наступным годзе адчыняе другую падобную школу ў маёнтку пана Гарадзялкоўскага ў Магілёўшчыне, не пакідаючы свае агульнае па-зашкольнае грамадзкае дзеяльнасьці.

У 1908 годзе царскія судзьдзі прыгаварылі энэргічнага, няўгомнага Коласа на тры гады вастрогу, якія ён і праводзіць у менскіх царскіх казаматах. Пазакратавае жыцьцё выкарыстоўвае Колас на тварэньне сваіх найлепшых вершаў і распачынае пісаць найбольш выдатную працу— поэму „Новая Зямля“. Вастрог ня можа зламаць энэргіі поэта, ён і надалей пяе свае „песьні няволі“, але „душа яго ня плача“ і „грудзь ня рвецца“. Тут пясьняр гартуе сваю волю, набірае яшчэ большага перакананьня аб слушнасьці свае барацьбы і барацьбы масаў, яшчэ мацней пранікае нянавісьцю да „турмы народаў“. Па выхадзе з вастрогу ў 1911 годзе Колас ізноў прыступае да чыннай грамадзкай працы, аддаючы ўсё, што можа на аўтар вызваленьня сябе і сваіх братоў з путаў цемры, вызыску і ўціску. Выбухае сусьветная вайна. Яна кідае Коласа на румынскі фронт, але ў зьвязку з хваробай лёгкіх, ён хутка

гэтых бараноў, падкармліваў і прывёз за 70 вёрст у Вільню даплаціў хваставога 10 грашоў. Аб ботах тады ўжо I. Б. зусім „забыўся“. Вось і жыві і разьвівай гаспадарку!“ — заканчвае ў роспачы „Бел. Крыніца“.

Гэта бязумоўна, не перашкаджае ёй на другой старонцы і ў іншых нумарох прапагаваць „па хрысьціянску“ аб тым, што прычынай бяды селяніна, зьяўляецца „брак ашчаднасьці“ і „жыцьцё над стан“.

Сацыял-дэмакратыя і адналіты фронт.

Усё часьцей і часьцей чуюцца аб ім галасы з боку сацыял-дэмакратыі. Нядаўна аб гэтым гаварыў праз радыё яе нямецкі правадыр Лёбэ. Што аднак адбываецца ў практыцы найлепей сьведчыць наступны вынятак з цікавай карэспандэнцыі, якая была зьмешчана ў „Kur. Wil.“ з 20 г. м:

„У тым самым часе, калі Лёбэ заклікаў у Вене да адналітага пролетарскага фронту проці трыумфуючай рэакцыі, яго партыйныя таварышы вялі перагаворы з Папэнам, а дзесьці за кулісамі тваяліся інтрыгі, перакідаючыя мост паміж нацыянал-сацыялістамі і сацыял-дэмакратычнымі праф. саюзамі, а камуністычная прэса задорна абвяшчала будучую коаліцыю: Вэльс—Шляйхэр—Штрасэр... Ніхто, ведама, ня верыць, каб партыйныя бюрократыя стварыла калісьці адналіты пролетарскі фронт. Сацыял-дэмакраты будуць і далей пацірацца каля моцных гэтага сьвету і ўкладаць папяровую рэзалюцыю пратэсту. Ня ў гэтым аднак справа. Адналіты пралетарскі фронт не паўстане на нарадах партыйных бюрократаў, ані шляхам згоды правадыроў. Створыцца ён у глыбіні мас, на хвалях забастовачнага руху, на бунтах галоднай масы і будзе сцементаваны супольна пралітай крывёй... Першыя адзнакі прабудзэньня адналітага пралетарскага фронту ўжо можна заўважыць. І калі Лёбэ кажа аб яго канечнасьці дык гэта вельмі шмат значыць. Ведама, гэта толькі тактычны манэўр сацыял-дэмакратычнага правадыра, які мусіць лічыцца з інстыктоўным імкненьнем працоўных мас да згуртаваньня разоў. Сацыял-дэмакратыя атрымлівала паражку за паражкай з прычыны сваёй угадовай коаліцыйнай палітыкі. Каб утрымаць свой упадак, яна падставіла свае крыльлі пад вецер радыкалізму. Куды ён яе занясе?

Апошнія выбары прынесьлі камуністам перамогу за перамогай: па меры таго як Гітлер трацiць свае легіёны, узрастае камуністычны лягер. У Саксоніі пасьпехі камуністаў перавышаюць страты сацыял-дэмакратаў. Шмат былых гітлероўскіх выбаршчыкаў перайшло да камуністаў. Да камуністаў пераходзяць ня толькі радавыя гітлероўцы: сярод уцекачоў ёсьць вядомыя партыйныя дзеячы з гітлероўскага лягеру. І камуністы не без задаваленьня частуюць удзельнікаў сваіх мітынгаў лакомай патравай: на сцэну выходзяць па калейцы ў бронзавай уніформе ўдзельнікі гітлероўскіх баёвак, зрываюць з сябе партыйныя адзнакі і абвяшчаюць пад гучныя воплескі аб сваім прылучэньні да камуністаў“...

У. Клімік.

Я. Купала.

МУЖЫК.

Што я мужык, усе тут знаюць,
І, як ёсьць гэты сьвет вялік,
З мяне сьмяюцца, пагарджаюць, —
Бо я мужык, дурны мужык.
Чытаць, пісаць я ня умею,
Ня ходзе *) гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею, —
Бо я мужык, дурны мужык.
Бо з працы хлеб свой дабываю,
Бо зношу лаянку і крык,
І сьвята рэдка калі знаю, —
Бо я мужык, дурны мужык.
Галеюць дзеці век бяз хлеба,
Падзёрты жончын чаравік,
Ня маю грошы, на патрэбу, —
Бо я мужык, дурны мужык.
Заліты потам горкім вочы;
Ці я малы, ці я старык, — **)
Працую, як той вол рабочы, —
Бо я мужык, дурны мужык.
Як хвор ды бедзен—сам бяруся
Лячыць сябе: я чараўнік!
Бо я бяз доктара лячуся, —
Бо я мужык, дурны мужык.
Што голы я, павінен згінуць,
Як той у лесе чашчавік,
І, як сабака, сьвет пакінуць, —
Бо я мужык, дурны мужык.
Але, хоць колькі жыць тут буду,
Як будзе век тут мой вялік,
Ніколі, братцы, не забуду,
Што чалавек я, хоць мужык.
І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык,
Што, хоць мной кожны пагарджае,
Я буду жыць!—бо я мужык!

*) Провінц.—Ходзіць.
**) Русіц. — Стары.

НА НАШЫХ ЗЕМЛЯХ.

Выпісывайма „Шлях“.

Барановічы. Доўга прыглядаўся я да беларускай вёскі, да яе жыцьця ў цёмным і несьвядомым кутку. Праканаўся, што вёска ў нашым вокругу мала бярэцца да працы і німа каму яе навучыць і накіраваць на сьвятлейшую дарогу.

Вось-жа тут зварачываюся да суседніх вёсак: Валохвы, Малахоўцы, Карчэва Ястрамбскай гміны з заклікам: хлопцы, пара вам прабудзіцца, пара разьвітацца ўжо з гарэлкай, пара ўзяцца за працу. Толькі такім чынам можам паправіць сваё жыцьцё. Ці ня лепш было-б, каб вы тыя грошы, якія аддасьцё на гарэлку, паслалі-б на сваю родную газэту, дзе магліб даведацца шмат чаго новага і цікавага і якая шмат чаго можа нас навучыць.

Выпісывайце нашу родную газэту „Шлях“, каторая вышла ў сьвет нам на прасьвету.

Баранавіцкі.

„Розвёнзаньне на стагнаньне“.

(Пружаншчына).

Вёска Шэні. Таму гаду таму назад пружанскі староста „розвёнзал“ Пружанскую гмінную раду, звальняючы адначасна войта Януша і пісара Ленскага, а на тымчасовага кіраўніка, да новых выбараў, выпісаў асадніка з пад Малараты — Сурвілу.

Адразу гэты панок пачаў рабіць „ошчэндносьці“, незважаючы, што сялянам трашчаць косьці, дык нічога дзіўнага, што апошнія чакалі новых выбараў, як нейкага збавеньня. Але начальства чамусьці ня надта аб іх клапацілася. Нарэшце прыйшоў час на выбары паўнамоцнікаў. Ня знаю дакладна аб іншых абводах, а Шэняўскі абвод меў права выбраць 8 паўнамоцнікаў, якія 12. III. г. г. у школьным будынку і ў прысутнасьці прадстаўніка з староства, ды 4 паліцыянтаў былі выбраны шэняўскім сялянствам. Здаецца ад паўнамоцнікаў не далёка і да выбараў радных ды войта, але аказалася, вялікая далячыня. Двойчы ўневажняў староста выбары, можа ўнязважніўбы і яшчэ некалькі разоў, каб „лёяльныя“ выбаршчыкі, дзякуючы сялянскай зьнеахвочанасьці, ня выбралі з пасярод сябе „лёяльных“ радных. Па добна адбыліся выбары ў верасьні г. г. у пружанскі соймік.

Асабліва з Шэняў пёрся ў радныя (а можа ў войты) М. Рэфэрэнт. За ўсялякую цану стараўся адмовіць паўнамоцніка П. Шышку ад свае кандыдатуры, але гэта яму не ўдалося. Дарма толькі небарака пабіўся ў гміне з сваімі пабрацімцам Валанцэвічам, ды так моцна, што аж зубы збіраліся ў жменю. Трэба дадаць, што Валанцэвічу мандат раднага каштаваў не адну бутэльку, на якія пакваліліся шубэцкія паўнамоцнікі, на чале з Курачынскім і В. Бабруком...

Цікавыя рэчы дзеяліся пры выбарах войта. Староста адкінуў кандыдатуру на войта Бэта, а зацьвердзіў на год „ошчэндносьцевага“ Сурвілу. І робіць гэты панок „ошчэндносьці“ коштам зьбядзелых да крайнасьці сялян. Дзеля таго каб накрыць школьны будынак у Шэнях з фундушаў гмінных, ён дае загад солтысу забіраць у сялян апошнія кулічкі саломы, што той і робіць. А можа і ўдасца яму такім чынам пакрыць даўгі ў суме 40 тысяч зл., што нарабіла гміна.

Агонь.

Выпадак пры сьцягіваньні падаткаў.

„У кал. Лайкаўшчына, Бяліцкай гм., земляроб Адвард Капровіч разам з другімі сялянамі, прабавалі аказваць супраціў сэквэстратару і паліцыянту, каторыя замерваліся за даўгі забраць яго маемасьць“. („Słowo“ 10.XI 32 г.

Згарэў у гумне.

Нядовячы спаліўся ў гумне Я. Каваллевіча жыхара з. Рыбацішкі, Язьвінскай гм., 76-гадовы жабрак К. Удавец, які, нямаючы дзе пераначаваць, зайшоў у гумно, закурыў люльку і заснуў з ёй. У ночы выбухнуў пажар. К. Удавец згарэў разам з гумном.

Прыгавары на сьмерць.

7 г. м. Акр. Суд у Баранавічах разглядаў справу трох братоў Уладз., Вацл. і Міх. Петрашэўскіх, якія абвінавачыліся ў шпіёнстве. Суд засудзіў Уладз. Петрашэвіча на кару сьмерці праз павешаньне, Вацл. Петрашэвіча на бястэрміновы вастрог і Міх. Петрашэвіча на 15 гадоў катаргі.

Баптысты ў процідзяржаўнай працы.

„На абшарах маладэчанскага і валожынскага пав. затрымана некалькі асоб, каторыя пад прэтэкстам абʼяжджаньня і адведываньня малітвенных дамоў баптыстаў, займаліся між мясцовай люднасьцю процідзяржаўнай агітацыяй. Затрыманых агітатараў скіравана да дысцыплны сьледчых уладаў“. („Dz. Wil.“ 11.XI 32 г.).

Фабрыкацыя фальшывых манэтаў.

У в. Косьцянова, Невяроўскай гм., выкрыта яшчэ адна „фабрыка“ фальшывых манэтаў у будынку Фам. і Тад. Марковічаў. Марковічы з нейкім Унцэрам выраблялі прымітыўна з волава 50 гр. і 1 зл. манэты. Знойдзена прылады для фальшаваньня і некалькі манэтаў.

Дамагаюцца паправы свайго быту.

У Сьвянцянах у фабрыцы вайлакоў выбухнуў штрайк работнікаў, як пратэст супроць адмовы працы. Да штрайку прыступіла 150 чалавек. Работнікам ходзіць аб тое, каб адпрацаваць адпаведную лічбу тыдняў, што ім дало-б магчымасьць карыстацца з помачы для безпрацоўных.

Памёр з голаду.

У засьць. Ліпава неманчынскай гміны знайдзена на дарозе скамянеўшага трупа незнанага мужчыны. Аказалася, што нябошчык гэты быў жабраком, каторы хадзіў у гэтай мясцовасьці.

Памёр ён з голаду. Прозьвішча яго пакуль што, неведамае.

звальняецца са службы і вяртаецца да свае сямʼі ў Курскую губэрню.

Пасьля рэволюцыі аж да сяньняшняга дня разам з Купалай знаходзіцца ў Менску, не пакідаючы пяра і практычнай дзеяльнасьці ў кірунку дапамогі масам пабудаваць сваю культуру і гаспадарку. Так як і Я. Купала, Колас зьвязаў сябе „тысячамі ніцей“ з тым, што робіцца ў Усходняй Беларусі, аддаючы і надалей масам народу няязлічаныя ўслугі. І гэтая сувязь з масамі, праца і барацьба для шырокіх слаёў народу афармлена наданьнем песьняру у 1926 годзе ўрадам БССР годнасьці народнага поэта.

Жыцьцёвыя абставіны, гістарычныя варункі, гэтыя „тысячы ніцей, з якіх аснована і вытканa жыцьцё“, характар эпохі, калі выступаў на арэну дзеяльнасьці малады яшчэ Колас — усё гэта сталася жывой багатай крыніцай, якая пасьля напоўніла зьместам усю яго мастацка-літаратурную творчасьць. Колас—песьняр „з голадам зраднійшыхся, худых і абарваных“ сялян. Царская няволя, фэодальны грабежніцкі вызыск працоўнага сялянства, нацыянальны ўціск у найболып зьверскай форме—вось агульныя мамэнты, якія налажылі на Коласа сваю пячатку і якая знаходзіць выраз у-ва ўсёй дзеяльнасьці песьняра да апошніх дзён. Творчасьць Коласа—гэта голас „жальбы“ і „нуды“ беларускага прыгнечанага селяніна, „песьні пакутныя“ „няволяй зьвязаных“ — гэта крык протэсту супроць „царскага біча“, супроць прыгонніцкога вызыску, гэта заклік да барацьбы за „новае жыцьцё“, заклік да „шуканьня долі“, да „рваньня путаў“ да „пяяньня новых песень“, гэта выраз нязломнае веры ў тое, што ідэалы шырокіх масаў беларускага народу будуць зьдзейсьнены, што „хоць некалі, а прыйдзь дачакаемся“. Парэволюцыйныя творы Якуба Коласа даюць нам часта жывы, яскравы, рэльефны малюнак таго жыцьця, якое рэалізуецца па другой старане нашай усходняй граніцы. Цяперашнія песьні Коласа—гэта выраз пачуцьцяў, якія пераважаюць сяньня наш народны поэт.

У папярэднім нумары нашае газэты мы ўжо зазначылі, апіраючыся на словы грам. Езавітава, што Колас у сучасны мамэнт знаходзіцца ў поўным расквіту сваіх сіл і творчасьці. Таму трэба спадзявацца, што талент нашага поэта і варункі яго сучаснага жыцьця дадуць нам яшчэ ня мала песень.

50-ігадовы юбілей нашых абодвых народных поэтаў—гэта юбілей усіх тых з кім свой лёс зьвязалі песьняры. Гэта сьвята найшырэйшых слаёў беларускага народу. Тыя колы з-пасярод нашага грамадзянства, якія зьяўляюцца рэпрэзэнтантамі заможнай часткі беларускай нацыі і якія зьвязалі свой лёс з няпрыхільнікамі нашага нацыянальна-адраджэнскага руху стараюцца таксама адзначыць гэты юбілей, ставячы перад сабой задачу з аднаго боку „ачысьціць“ творчасьць абодвух поэтаў ад народна-вызвалейчага духу, падрэзаць карані праўдзівай ідэолёгіі нашых волатаў нацыянальнага і сацыяльнага руху, а з другога боку, спэкуляваць імёнамі Купалы і Коласа набіць сабе капітал папулярнасьці ў масах маласьведамага грамадзянства. Больш рухлівая частка гэтых кругоў ладзіць з вялікаю помпаю „акадэміюˮ ў часьць Купалы і Коласа; другая частка зьмяшчае ў сваёй прэсе шумныя артыкулы, „даказваючы“ прыпомачы да нуды абʼежджанага аргументу аб „новым сталінаўскім курсе“, што ліры Коласа і Купалы „заглушаны“, што яны ўжо „жывыя нябожчыкі“ і т. д. і т. п. Колькі праўды і якая тэндэнцыя крыецца пад гэтымі словамі—зразумела сама сабой. А калі мы да гэтага ўспомнім папярэднія „рэвэляцыі“ той-жа прэсы аб „арышце“ Якуба Коласа і аб т. зв. „пробе самагубства“ Янкі Купалы, на якія пасьля і Колас і Купала ўласнаручна мусілі пісаць запярэчаньні дык шыла сама сабой вылезе на верх. І ўсе стараньні, як „Бел. Крыніцы“ так і „Звону“ прыкрыць свае праўдзівыя інтэнцыі прыгожымі фразамі застануцца без пасьпеху.

Юбілей Коласа і Купалы павінен стацца для нас стымулам да ўзмацненьня працы ў нацыянальна-вызваленчым руху, павінен быць штуршком да распашырэньня тае ідэолёгіі якой служылі нашы песьняры, нашы будзіцелі, якія ўжо даўно нам сказалі, што і мы людзі,

„Што і нам гараваць
Надаела ўвесь век“!..

Адусюль па трошку.

— **Начную рэвізію зрабілі скарбовыя ўрадоўцы** ў памешканьні адваката д-ра Г. Вінікевіча ў Бубрцы, які незаплаціў некалькі сот зл. падатку. Пры рэвізіі знайдзена толькі 4 зл. 50 гр., якія і пакінулі беднаму адвакату.

— **Гандлёвыя перагаворы з Польшчай вядуць** прыехаўшыя з Масквы прадстаўнікі Внешторгу.

— **Вялізарны тэатр у СССР.** „Усе, хто адведвае Савецкую Рэспубліку, як энтузіясты, так і крытыкі — згодны ў адным, што ад бальшавіцкага перавароту тэатральнае мастацтва ў Саветах зрабіла вялікія поступы.

Як аказваецца, савецкія ўлады ня думаюць спачыць на ляўрах і ў найбліжэйшай будучыне прыступаюць да будовы ў Новасыбірску вялізарнага тэатру, каторы будзе зьмяшчаць 5.000 глядзельнікаў і да 3.000 асобаў на сцэне. Гэта будзе такім чынам, першы на сьвеце тэатр, у якім можна будзе ставіць рэчы, выводзячыя на сцэну натаўпы. Апрача таго тэатр будзе абарудаваны ў найнавейшыя здабычы тэхнікі, каторыя між іншым, пазволяць на граньне без антрактаў (перарываў). Урэшце тэатр у выпадку патрэбы можа быць заменены на цырк з аграмадным водным басэйнам на арэне. („Robotnik“ — 15 XI)

— **Мережкоўскі** (вядомы расейскі пісьменьнік на эміграцыі) галадуе, хаця кніжкі яго шмат друкаваліся. Жыве ён у Францыі.

— **Вострыя рэпрэсіі ў адносінах да камуністаў у Бэрне.** У зьвязку з апошнімі камуністычнымі забурэньнямі ў Швэйцарыі фэдэральная пракуратура мае замер правясьці вострую акцыю з мэтаю апанаваньня камуністычнага руху Швайцарыі.

— **Барацьба трамвайшчыкаў у Шанхаю.** Паводле газэтных вестак ужо 6 тыдняў вядзецца барацьба шанхайскіх трамвайшчыкаў. 19-га г. м. бастуючыя прыпусьцілі штурм на будынак, у якім месьціцца сядзіба ўладаў трамвайнага таварыства. Адбылася страляніна з паліцыяй. 15 асоб ранена.

— **Працэс камуністаў у Радаме.** У Радаме нядаўна закончыўся працэс 10 камуністаў, якія абвінавачваліся ў антыдзяржаўнай дзеяльнасьці. Суд прыгаварыў усіх ад 4 да 1 году вастрогу.

— **Безрабоцьце ў Канадзе.** Паводле заявы міністра працы ў Канадзе, карыстаецца сяньня з дапамогі 800 тысяч мужчын, кабет і дзяцей, што выносіць 8 проц. усяе люднасьці.

— **Паўстаньне ў Арабіі.** Газэты пішуць аб выбуху паўстаньня ў Арабіі супроць караля Гэджасу. Весткі з пэўных крыніц кажуць аб тым, што паўстаньне носіць грозны характар.

— **Тры выракі сьмерці.** У Ваўкавыску надзвычайны суд засудзіў Юльяна Капітана, В. Коркейчыка і Я. Дульчэўскага абвінавачаных у нападзе і забойстве В. Севостьянчука. Усіх трох суд прыгаварыў на кару сьмерці.

Прыгавар выканаыы.

— **Троцкі з Турцыі едзе цяпер у Копэнгагэн.** Паводле пагалосак у кругох нямецкіх прыхільнікаў Троцкага, мэтай яго зьяўляецца не Копэнгагэн, але Фінляндыя, дзе ён нібы маецца затрымацца на даўжэйшы час, каб магчы сачыць за выпадкамі ў СССР і рабіць уплыў на акцыю сваіх прыхільнікаў у Саветах.

— **Безработныя ў Радзёнкове** ў ліку 1000 асоб наладзілі дэманстрацыю перад намяшчэньнем гміны з прычыны неатрыманьня помачы ў спадзяванай высокасьці. Паліцыя не дапусьціла дэманстрантаў да будынку гміны.
(„Роботнік“ 17.-XI. 32 г.).

— **Перамога чырвоных у Кітаі.** „Наше Время“ паведамляе: Паводле вестак з Пуч-Жоў (порт у паўднёвым Кітаі) войскі Кітайскай Чырвонай Арміі, наступаючыя на Фуні-Зян разьбілі 7-ю нанкінскую дывізыю, бяручы 5 тысяч у палон і захапіўшы 4 пушкі.

— **Баі пад Цыцыкарам прадаўжаюцца.** У Манджурыі ня ўціхае вайна між японскімі войскамі і паўстанцамі. У сувязі з частковаю перамогаю паўстанцаў Японія выслала вайсковую дапамогу.

— **Вайна паміж Балівіяй і Парагваем.** Вайна паміж двума паўднёва-амэрыканскімі дзяржавамі набірае ўсё большых разьмераў. Нядаўна каля порту Спаведра адбылася зацятая бітва паміж парагвайцамі і балівійцамі, у якой першыя панясьлі паражку, страціўшы 200 асоб забітымі і раненымі.

— **Забастоўка 300 рабочых на шкляным заводзе** ў Кракаве выбухла з прычыны незаплаты ім на працягу 3-х месяцаў за працу.

— **Сэнаты ўнівэрсытэтаў** у Львове, Кракаве, Варшаве, Пазнаню і Вільні выказаліся проці праектаванага міністрам Асьветы агранічэньня аўтономіі вышшых школ.

— **Упадак прамысловай прадукцыі.** На пленарным паседжаньні сойму дня 3-га лістапада польскі міністар фінансаў Завадзкі ў сваёй прамове сказаў: „Праз увесь пэрыяд бягучага году ўва ўсіх амаль краінах можам заўважыць далейшае скарачэньне працэсу вытворчасьці. Сусьветны індэкс (паказьнік) прамысловай прадукцыі абнізіўся ў параўнаньні з 1928 г. на каля 35 пунктаў, а яшчэ на 15 пунктаў у параўнаньні з прошлым годам, у зімовых месяцах каля 30 мільёнаў безработных абцяжала „рынак працы“.

— **Галодныя паходы ў Аўстрыі.** У розных мяйсцох Верхняй Аўстрыі 19.-XI. 1932 г. пачалі арганізавацца пры помачы камуністаў галодныя паходы, якія накіроўваліся да м. Ліпцу. Паліцыя і жандармэрыя паходы разагнала, пры гэтым арыштавала 87 асоб.

— **Натоўп камуністаў заняў ратуш.** Натоўп камуністаў, зложаны з мужчын, жанок і дзяцей заняў 19.-XI. ратуш у Франкфурце н/Мэнэм (Нямеччына). Дэманстранты абставілі ўсе дзьверы, прычым уварваліся ў памешканьне грамадзкай апекі. На фотэлях урадоўцаў парассаджвалі дзяцей. Натоўп, складаючыся пераважна з жыхароў баракаў для безработных, дамагаўся хлеба і вугля. Заскочаныя ўлады змушаныя былі зрабіць уступкі. Па пэўным часе паліцыя гмах апаражніла без разьліцьця крыві, аднак праз дзьве гадзіны дэманстранты былі поўнымі панамі ў ратушу.

— **Рэдукцыі ў Лодзі.** Спынілі працу тэкстыльныя фабрыкі фірмы „Шарблера і Громана“ выкідваючы на брук 6.100 рабочых,

— **У Дамброўскім басэйне** зачынена цэмэнтоўня „Ключы“. Зрэдукавана 120 рабочых.

Капальня „Сатурн“ адмовіла ў працы 150 работнікам.

Адбыліся рэдукцыі ў гутах, належачых да моджэеўскіх закладаў.

— **Новая Гэс** (Гідра-Электрычная станцыя), „Наше Время“ падае паводле „Тассу“, што 15-га лістапада пускаецца ў рух „Дзорагэс“. У рад дзеючых гігантаў уступае Гідро-Цэнтраль-Армения „Дзорагэс ім. Сталіна“, з сілаю 31.500 конскіх сіл.

„Шлях“ — найлепшы прыяцель селяніна і работніка.

ГАСПАДАРКА.

Зборы ільну.

Лён на Зах. Беларусі зьяйляецца адной з важнейшых культур. Як падае „Przegląd Gosp. Ziem Półn.-Wsch.“ у гэтым годзе ўраджай выносіў 50—70 проц. прошлагодняга. Прыблізны спадак прадукцыі для Валожынскага раёну выносіць 25 проц., Гадуцішскага — 30 проц., Мачэньцовага 40 проц. У гэты самы час СССР: „выняткова хутка выканаў зборы, якія на дзень 20 верасьня былі выкананыя ўжо на 91,7 проц. Трэба спадзявацца, што мачэньне там будзе закончана яшчэ перад выпадам сьнегу, які ў прошлым годзе захапіў каля 25 проц. ураджаю. Можна такім чынам лічыцца з значным узростам савецкай прадукцыі“.

Ня лішнім будзе дадаць, што ў савецкай прадукцыі ільну, БССР займае значнае месца.

Прамысловасьць у Горадні.

Горадня — гэта адзін з буйнейшых гарадоў Зах. Беларусі. Ня мела яна вялікай прамысловасьці, але тое, што было „да 1927—1929 году разьвівала досыць моцную прамысловую дзеяльнасьць, даючы рух месту і ваколіцы, а таксама працу многім рабочым.

Цяпер ува ўсіх прадпрыемствах пануе амаль поўны застой: тытунёвыя фабрыкі і фабрыкі гарэлкі былі зьліквідаваны ў 1925 г., г. зн. у часе ўвядзеньня дзяржаўных манаполяў. З бровараў (было іх 3) чынны цяпер толькі адзін пры вельмі слабай прадукцыі. З шасьці тартакакоў працуюць толькі два, з сямі гарбарняў — тры, пры вельмі павольнай працы з недахопу збыту для сваёй скарочанай прадукцыі. З гэтых самых прычын нячынныя цяпер шкляная гута і цагельні, а фабрыка „Нёманская“ і графічныя заклады „А. Лапін і С-ка“ зрэдукавалі працу да 2 — 3 дзён у тыдні пры мінімальнай лічбе работнікаў.

З гэтай прычыны ўзрасло безрабоцьце і голеч у рабочых радох. Паколькі афіцыяльныя даныя акрэсьліваюць лічбу безпрацоўных на 1500 асоб, пастолькі фактычна, паводле даных прафэсыянальных арганізацый, лічба безработных у Горадні разам з работнікамі не рэестраванымі ў Аддзеле Безрабоцьця, дасягае катастрафальнай лічбы 4.000 асоб. Безрабоцьце разам з земляробскім крызісам і зьбядненьнем вясковага насяленьня ўплыло на спадак спажыцьця і на застой у гандлі“. („Przeg. Gospod.“).

Напамінаем, што у будучыне высылаем газэту толькі тым, хто прышле падпісную плату.

Впісвайыце і аплачвайце „Шлях“!

Віленская хроніка.

— **Безрабоцьце.** Паводле апошніх аблічэньняў, у Вільні ёсьць 5597 безработных, сярод якіх найбольш умысловыя працаўнікі і некваліфікаваныя рабочыя. У параўнаньні з папярэднім тыдням безрабоцьце пабольшылася на 27 чалавек.

— **Здароўе школьных дзяцей.** Паводле апошніх даных на агульны лік 17.134 дзяцей агульных публічных школ, брудных дзяцей было — 4192, вашывых — 4097. Хворых на каросту—20, на іншыя скурныя — 267. сухоты падазроныя — 11, сухоты сьцьверджаныя—1, сухоты дыхавых жалез — 28, хваробы носа — 66. вушэй 55, ягліца — 15, іншыя хваробы вачэй 360, недахопы ўзроку 63, сэрца — 2. Апроч таго наступныя выпадкі заразных хвароб: ветравая воспа — 14, ружы — 2, сьвінка — 2, ангіна — 1, дыфтэрыт—1, брушны тыф — 1. Даныя адносяцца да прошлага месяца.

— **Бойка ў Яўрэйскім Студэнцкім Саюзе.** У прошлую пятніцу ў часе ладжаньня „жывой газэткі“ узьняліся спрэчкі паміж двума адламамі сіяністаў з Яўрэйскага Студ. Саюзу. Ад слоў хутка перайшлі да чыну, так, што ў працягу поўгадзіны крэслы лёталі ў паветры. Частка студэнтаў потым замкнулася ў адным з пакояў, каб прадаўжаць „жывую газэту“, аднак іх праціўнікі выламалі дзьверы і ўзнавілі бойку. Кончылася тым, што адна частка студэнтаў была сілай выкінута з памешканьня, а рэшта кончыла досыць „жывы“ вечар.

— **Скарачэньне бюджэту.** Ваяводзкія ўлады, прагледзеўшы праект 5-ці месячнага бюджэту г. Вільні, зажадалі скарачэньня яго на амаль 1 мільён зл., што Магістрат маецца зрабіць.

— **Браніслаў Тарашкевіч у Вільні.** У сувязі з зьбліжаючымся працэсам, які адбудзецца 28 г.м., Б. Тарашкевіч прывезены ў Вільню і пасаджаны ў Лукішскі вастрог.

— **Дажывотная катарга.** 16 г. м. „Даразны“ Акружны Суд засудзіў Васіля Лапача, за шпіянаж на карысьць адной з суседніх дзяржаў, на дажывотную катаргу.

— **Бульба для безпрацоўных.** Ваяводзкі К-т для спраў безрабоцьця нядаўна купіў 1 мільён кілёграмаў бульбы. Безпрацоўныя, закваліфікаваныя спэцыяльнай камісіяй, будуць атрымліваць у залежнасьці ад ліку асоб 200—400 кілёграмаў ($12^1/_2$—25 пудоў) на ўсю зіму. Як падаюць газэты, Магістрат таксама хоча прыйсьці на помач безпрацоўным.

— **23-гадовы работнік засыпаны зямлёй.** 21 г. м. у часе земной працы пры Буфаловай Гары вялікі кавалак замёрзшай зямлі засыпаў жыўцом аднаго з працуючых рабочых. Прысутныя тут-жа таварышы па працы хутка яго адкапалі, аднак ён дастаў здушэньне грудной клеткі і ў цяжкім стане быў перавезены ў шпіталь.

Наша пошта.

Усім нашым прыхільнікам шчыра дзякуем, за добрыя пажаданьні і прывітаньні „Шляху“.

Рэдакцыі месячніка „Беларуская Школа ў Латвіі“. З усімі Вашымі прапазыцыямі аб узаемным супрацоўніцтве ў галіне распашырэньня і абменны нашых выданьняў — цалком згаджаемся, вітаючы адначасова гэтую прыгожую думку. У гэтай справе высылаем да Вас спэцыяльны ліст. — **В. з Моўчадзі:** „Шлях“ Вам і на паданыя Вамі адрасы высылаем. Чакаем карэспандэнцыяў і артыкулаў — **Аганьку з Пружаншчыны:** Карэспандэнцыю з пэўнымі папраўкамі зьмяшчаем і згодна з Вашай просьбай залічаем Вас да нашых сталых карэспандэнтаў. Апрача таго высылаем Вам пісьмо. — **Аўтару фэльетону: „По барину говядина“:** фэльетон да друку не надаецца. — **Янку Шастаку:** Карэспандэнцыю зьмяшчаем, дзякуем. Пішэце больш. Пробныя нумары на паданыя адрасы высылаем.—**Чытач з Трабаў:** пробныя нумары высылаем і чакаем падпіскі. Залічаем Вас да сталых карэспандэнтаў. З паданага факту скарыстаем.

Хлебаробу: газэту высылаем, чакаем падпісной платы —**А. Сяргею:** газэту высылаем. Аб календары павядомім. Атрымалі грошы ад наступных падпішчыкаў: Капач Эдвард з Жодзішак 2 зл.; Патаповіч Янка і В. Янцэвіч з Рачканаў — 3 зл.; Бібліятэка чытальня ў в. Шэні — 2 зл. 50 гр.; — Літвіновіч Алекс з в. Ялова—2 зл. 50 гр.;—Такарэвіч Пётра з м. Ашмяны — 50 гр.; — Літвінчык Алексы з в. Аніцэвічы—1 зл.; Мароз Янка з Вялейкі—50 гр.; Асіповіч Павал з ф. Манюшчыцы—1 зл.; Устымчык Лявон з в. Рудэк — 50 гр.; Ільяшук Ал. з в. Куплін — 1. зл. 25 гр.; Вольчык Іг. з в. Долге—1 зл. 25 гр., Бажкевіч Мікола з Пружаншчыны — 50 гр.; Мамчыц Аўгень з м. Дэлятычы—1 зл.; Пагуда Мікола з в. Жолткі — 1 зл. 50 гр.; Глушын Ф. з в. Рэпішэ — 50 гр.; Багдан Язэп з в. Стараволя—1 зл. 50 гр.; Грыгарчук Яз. з Беластоку — 2 зл. 50 гр.; Грыцук Мікола з Беластоку — 2 зл. 50 гр. і 50 гр. на прэс. фонд.; Шымка Янка з в. Любовічы — 1 зл.; Аніська з Друі—50 гр.; Гасіцкі К. з в. Гарадзей-Верхні—1 зл. Працяг у наступным нумары. **Газэту ўсім высылаем.**

Рэдактар-выдавец: К. Чартовіч.

Друкарня Я. Баеўскага, Вільня, вул. Мастовая 9.